# НАВУКОВА-ДАСЛЕДЧАЯ ПРАЦА ШКОЛЬНІКАЎ



У сучаснай Канцэпцыі літаратурнай адукацыі асаблівая ўвага надаецца выпрацоўцы крытычнага і мадэлюючага мыслення школьнікаў, культуралагічнаму і культуратворчаму развіццю, а ў гэтым рэчышчы навукова-даследчай рабоце, якая вядзе да актыўнага пазнання, дае рэальную магчымасць уключыцца ў дыялог з сур'ёзнай навукай – літаратуразнаўствам. Даследчая работа дае юным прыхільнікам літаратуры каштоўны вопыт і шанц здзейсніць цікавае адкрыццё. Для некаторых гэта праца можа стаць зацікаўленасцю мастацтвам слова на ўсё жыццё, а для кагосьці і першым крокам да будучай прафесіі. Але такое адбываецца пераважна ў тым выпадку, калі юныя даследчыкі адчуваюць зацікаўленасць, ухвалу і падтрымку. Да таго ж увага да ўжо здзейсненых цікавых літаратурных даследаванняў дазваляе пашырыць кола знаёмства з імі, а тым самым зацікавіць і заахвоціць паспрабаваць свае сілы новых аматараў адкрыццяў. Дарэчы тут будзе ўзгадаць мудрую татарскую прыказку: хочаш узрасціць волата – не шкадуй палатна на пялёнкі.

Менавіта такая пазіцыя вызначыла рашэнне Гродзенскага абласнога аддзялення Саюза пісьменнікаў Беларусі наладзіць знаёмства з працамі юных даследчыкаў праз іх размяшчэнне ў рубрыцы "Зялёны радок" афіцыйнага Інтэрнэт-сайта ГАА СПБ www.pisateli.by .

**Алена Вітальеўна РУЦКАЯ**
заслужаны настаўнік Беларусі,
літаратуразнаўца, літаратурны
крытык, паэтэса, член Саюза
пісьменнікаў Беларусі.